Вераніка Бандаровіч

НАЙМЕННІ СА ЗНАЧЭННЯМІ ‘ГАЛАСІЦЬ’, ‘ГАЛАШЭННЕ’ Ў СТАРАБЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Галашэнне – гэта, па-першае, своеасаблівая форма выяўлення гора, смутку, дзе ў адзіны семантычны комплекс зліты спецыфічны напеў, імправізаваны тэкст, плач, асобая пластыка; па-другое, – адзін з найбольш старажытных жанраў народнай творчасці [1, *455*].

Ёсць меркаванне, што ўзнікненне галашэнняў звязана з воклічамі ад болю страты чалавека, «якія ператвараліся ў выслоўі, далучалі да сябе эпітэты, разрастаючыся паступова да велічыні самастойных паэтычных параўнанняў і іх сумы, аб’яднанай у адно цэлае як рытмам і рыфмай, так і асноўнай думкай усялякага галашэння наогул – узвялічыць пры народзе нябожчыка» [8, *41*].

Галашэнні, як правіла, прымеркаваны да пэўнага абраду (адрозніваюць пахавальныя, вясельныя галашэнні), вылучаюцца таксама пазаабрадавыя (бытавыя, ваенныя). Найбольш даўнюю гісторыю маюць галашэнні па памерлых.

Што датычыцца пытання аб суадносінах галашэнняў з музычнай сферай, то вядома, што самі народныя спевакі не залічваюць іх да песеннага жанру. Галасіць на традыцыйны напеў для іх абазначае «ўголас выказаць абіду» [6, *81*]. Навукоўцы ж азначаюць галашэнне як «адзін з найбольш старажытных музычна-паэтычных жанраў» [5, *32*], «жанр сямейна-абрадавай паэзіі і музыкі; своеасаблівы від песенна-рэчытатыўна-дэкламацыйнай імправізацыі лірыка-драматычнага характару» [7, *54 – 55*].

У старабеларускіх пісьмовых помніках выяўлены сінанімічныя рады намінацый са значэннямі ‘галасіць’, ‘галашэнне’. Часта з кантэкстаў немагчыма зразумець дакладна, што канкрэтна маецца на ўвазе: плач як спосаб выражэння гора або галашэнне – музычна-паэтычны жанр. Таму адносіць такія словы да музычнай лексікі мэтазгодна з агаворкай.

Паняцце ‘галасіць’ выражалі дзеясловы спрадвечнага паходжання *голосити, гучети, оплакати, оплакивати, плакати*, большасць з якіх адзначаецца ў помніках рэлігійнай літаратуры.

Словы *голосити, гучети* выяўлены ў наступных урыўках: «Дл\ того прето и мы ока\нныи плачмо и голосёмо» (Каліст, II, *311*); «на моуку сн%а своего смотр\чи... прест%аа мат%ка... говорити не могъла. але толко гоучела и м*л*сть слова давала. але голо*с* wсиплый звин*л*» (Пак. Хр., *11*).

Аднакаранёвыя дзеясловы *оплакати, оплакивати, плакати*, а таксама царкоўнаславянізм *сетовати* сустрэліся ў наступных кантэкстах: «е*с*ли оумножа*т*с\ дёти его к^{s} мечu и начатки его не насыт\тс\ хлёба: wстанки его оумрuть не покопаютс\ и оудовы его не wплачuть» (Зб. 262, *23*); «Спёва*л* пото*м* дв%дъ жалобливые пёсни wплакuючи смерть саuловu» (Бельск., *102б*); «оувы мнё двё сетованиа сетую. и два плачи плачю» (Чэцця, *14б*).

Са значэннем ‘голасна плакаць, прыгаворваючы (пры выражэнні гора, крыўды)’ зафіксавана слова *ляментовати* (< ст.-польск. *lamentować* < лац.

lāmentātiō – [2, *193*]): «Л\мен*т*овал теды дв%д велико на*д* саuло*м* и на*д* иwанаFаном» (Біблія, *358*).

Сінанімічны рад намінацый, аб’яднаных значэннем ‘галашэнне’, уключаў назоўнікі *голосанье*: «абысмо над грёхами нашими жалоснёйшій плачъ и голосане оучинили» (Каліст, II, *311*); *оплаканье*: «Wн^{s} же по оплакании потешивс\ ид\ше ко стрижущимъ овцё сво\” (Скар. КБ, *70*); *плачъ*, *сетование*: “оувы мнё двё сетованиа сетую. и два плачи плачю» (Чэцця, *14б*).

Для абазначэння пахавальных галашэнняў у старажытнасці выкарыстоўваліся таксама словы іншамоўнага паходжання *ляментацыя* ‘элегія, поўная суму’ (< ст.-польск. *lamentacyja* < лац. *lāmentātiō* ‘жаласнае нараканне, енкі’ – ЭСБМ, VI, *122 – 123*): «иwсиа... привезе*н* до ерuсалими и похова*н* в ца*р*ско*м* гробё з великим плачем и нареканем люди посполита а наболше^{s} еремиа, которы^{s} писал ламе*н*тацыю которию при гробё царском спёвано» (Бельск., *134б*); *ляментъ* ‘плач, песня, поўная суму’ (< ст.-польск. *lament* ‘моцны плач, звычайна са скаргай, шкадаваннем’ < лац. *lāmentum* ‘скарга, шкадаванне, галашэнне’ – ЭСБМ, VI, *122*): «бёлые головы што назацнё^{s}шие ламенты и пёсни барзо жалосные спёвают» (Бельск., *243б*), «вси спёваки и спёвачки и по сей день ламе*н*ты на*д* иwсие*м* повторае*т* и ако бы право*м* вошло во израилю: wто написано в ламе*н*тацыа*х*» (Біблія, *516*); *тренъ* (< польск. *tren* < лац. *threnus* < грэч. *φρενος* [2, 324]): «выйми просимъ вси з души, з серца трвогу для початку ляменту, принамней для трену» (Лям., *3*).

Галашэнне, як правіла, разлічваецца на аўдыторыю, але з абавязковым захаваннем дыстанцыі паміж выканаўцам і слухачом. Мэта плакальшчыцы – падпарадкаваць сабе аўдыторыю, аб’яднаць усіх суперажываннем – дасягаецца як сістэмай асацыяцый, што выклікаецца гучаннем абрадавага напеву, так і выразным інтанаваннем. Галашэнне ўключае ў сябе гаворку, спевы, стогн, выкрык, усхліпванне, рыданне [4, *81 – 82*].

Менавіта пералічаныя элементы, як нам падалося, названы ў П. Бярынды пры тлумачэнні слова *въскликновение*: «Въскликновеніе… Выкрикан^{s}е, похвалене, гидене, хлипан^{s}е, кричан^{s}е, выт^{s}е, гик^{s}, гукане, акъ по оумерломъ» (Бяр., *23*).

Сінанімічныя словазлучэнні, верагодна, са значэннем ‘галашэнне’ выяўлены ў наступным кантэксце: «Рыдануе: Ревный плачъ, смитный плачъ, жалобливый плачъ, смитокъ, нарёка^{н}е, хлипа^{н}е, смиток^{s}, плачъ, или слъзы, л\мент рыдателный, ревливый, плачливый, рыданіе на^{д}гробное, жалоба погрёбнаа, см%ртное а плачливое спёва^{н}е» (Бяр., *141*). Спалучэнне *жалобливые песни* адзначаецца ў «Хроніцы» М. Бельскага: «Спёва*л* пото*м* дв%дъ жалобливые пёсни wплакиючи смерть саuлови» (Бельск., *102б*).

На сучасным этапе для выражэння паняццяў ‘галасіць’, ‘галашэнне’ ў беларускай мове выкарыстоўваюцца словы і словазлучэнні *галасіць*, *прыказваць на голас*, *прычытваць*, *прыплакваць*, *кукаваць*, *выць*, *вылічаць* [3, *60*]; *галашэнне*. Значэнне ‘галасіць па кім-небудзь’ мае таксама лексема *лямантаваць* (ТСБМ, III, *73*).

СКАРАЧЭННІ

Бельск. – “Хроніка” М. Бельскага пачатку XVII ст.; Біблія – Біблейскія кнігі пачатку XVII ст.; Бяр. – Лексиконъ славеноросскій именъ толъкованіе, Всечестным отцемъ Кір Памвою Берындою… згромаженый (Куцеін, 1653); Зб. 262 – Зборнік біблейскіх кніг пачатку XVI ст.; Каліст – Евангеліе учителное, албо казаня на кождую неделю и свята урочистыи презъ святого отца нашего Калиста (Еўе, 1616); Лям. – Ляментъ у света оубогихъ (Вільня, 1620); Пак. Хр. – “Пакуты Хрыста” XV ст.; Скар. КБ – “Бивлия руска” Ф. Скарыны 1517 – 1519 гг. КБ – Кніга Быцця; ТСБМ – Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: У 5 т. Мн., 1977 – 1984; Чэцця – Чэцця 1489 г.; ЭСБМ – Этымалагічны слоўнік беларускай мовы. Вып. 1 – 8. Мн., 1978 – 1993.

ЛІТАРАТУРА

1. Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Т. 4. Мн., 1997.
2. *Булыка А. М.* Даўнія запазычанні беларускай мовы. Мн., 1972.
3. *Варфаламеева Т. Б.* Пахавальныя галашэнні ў сучасных запісах. Тыпы напеваў і раёны іх пашырэння // Пахаванні. Памінкі. Галашэнні. Мн., 1986.
4. *Ефименкова Б. Б.* Севернорусская причеть. М., 1980.
5. Краткий словарь терминов музыкального искусства. Брест, 1998.
6. *Можейко З. Я.* Песенная культура белорусского Полесья. Село Тонеж. Мн., 1971.
7. Музычны слоўнік беларуска-рускі=Музыкальный словарь русско-белорусский. Мн., 1999.
8. *Васілевіч У. А.* Беларускія жалобныя абрады і галашэнні. // Пахаванні. Памінкі. Галашэнні. Мн., 1986.